УПАЎНАВАЖАНЫ ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ
САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ГРОДЗЕНСКІ АБЛВЫКАНКАМ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ"
ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ "САЮЗ ПАЛЯКАЎ НА БЕЛАРУСІ"
БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАЕ ТАВАРЫСТВА Ў ПОЛЬШЧЫ
КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ ЎНІВЕРСІТЭТА Ў БЕЛАСТОКУ

# "ШЛЯХ ДА ЎЗАЕМНАСЦІ" XX

Шаноўнае спадарства!

Аргкамітэт Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Шлях да ўзаемнасці" прапануе Вам прыняць удзел у XX канферэнцыі, якая адбудзецца **23-24 кастрычніка 2014 г.** у горадзе Гродна.

Канферэнцыя прысвечана ўзаемаадносінам паміж народамі Беларусі і Польшчы, эканамічным, моўным, літаратурным, гістарычным, культурным, навукова-асветніцкім і іншым сувязям на памежжы. Плануецца таксама работа секцыі "Славянскае адзінства".

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі (з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, вучонай ступені і навуковага звання, пасады, рабочага і хатняга тэлефона) і тэмы дакладаў просім дасылаць да 24 верасня 2014 г. на адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 3, галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. Аргкамітэт, альбо на e-mail **religiya@mail.grodno.by**

Патрабаванні да афармлення тэксту даклада:

1) аб'ём да 8 старонак праз 1,5 інтэрвала ў рэдактары Word 7.0. Windows 97, шрыфты Times New Roman 14;
2) спасылкі праз спіс літаратуры, які падаецца ў канцы артыкула, напрыклад: [1, с.12], дзе 1 – нумар крыніцы ў спісе літаратуры, 12 - старонка крыніцы;
3) дыск з электронным варыянтам даклада і раздрукоўка падаюцца ў Аргкамітэт падчас канферэнцыі.

Выданне матэрыялаў канферэнцыі плануецца ў 2015 г.

Фінансавыя умовы: навукоўцы з беларускага боку ўдзельнічаюць у канферэнцыі за ўласны кошт, ці за кошт ВНУ (установы), у якіх працуюць удзельнікі канферэнцыі. Замежныя ўдзельнікі забяспечваюцца харчаваннем і начлегам за кошт Аргкамітэта. Даезд за ўласны кошт.

З павагай,
Аргкамітэт "Шлях да ўзаемнасці" – 2014

тэл. для даведак (+375 152) 73 55 92, 73 55 78

ОТ : ГРОДНЕНСКАЯ ПРАВДА ФАКС NO. : 80152 74 42 48 ИЮЛ. 08 2014 16:04 СТР1